

Хрост Пана Езуса ў Ярдане.

# 1. МЫ — СЯБРЫ ЕЗУСА

*Мы ўсім абавязаны Пану Богу. Ён стварыў для нас дзівосны свет, каб мы маглі ў ім жыць. Ад Бога мы атрымалі жыццё, сям'ю, родных і блізкіх. Ён аддаў свайго Сына Езуса Хрыста, каб вызваліць нас ад грахоў і вярнуць нам вечнае жыццё ў небе. Праз Духа Святога Бог не перастае адорваць нас сваім благаслаўленнем і любоўю, дапамагае станавіцца лепшымі.*



Праз сакрамэнт хросту мы становімся Божымі дзецьмі і далучаемся да Божай сям'і — Каталіцкага Касцёла. Мы выракаемся зла і стараемся жыць як сапраўдныя дзеці нашага Нябеснага Айца.

Езус Хрыстус — наш найлепшы Сябар. Ён сам выбраў нас сваімі сябрамі і хоча, каб мы падчас штодзённай малітвы дзяліліся з Ім нашымі радасцямі і праблемамі. Езус любіць нас і таму заўсёды чакае на святой Імшы.

> Вы сябры Мае,
> калі робіце тое,
> што Я наказваю вам.
>
> Евангелле паводле Яна 15, 14

Самая важная сустрэча з Панам Богам адбываецца ў сакрамэнце Эўхарыстыі, да якога неабходна належным чынам падрыхтавацца. Таму мы будзем:

- шчыра маліцца;
- чытаць слова Божае;
- пазнаваць Бога, прымаючы ўдзел у занятках па рэлігіі;
- цярпліва і з любоўю адносіцца да кожнага чалавека;
- ахвотна рабіць добрыя ўчынкі.

## МОЙ КАТЭХІЗІС

**Хрост** — гэта першы і самы неабходны сакрамэнт, праз які Хрыстус вызваляе нас ад першароднага граху і іншых асабістых грахоў, яднае нас з сабою, дае нам Божае жыццё, робіць нас дзецьмі Божымі, далучаючы да супольнасці Касцёла (*гл. табліцу сакрамэнтаў у Дадатку*).









**1.** Прачытай пытанні і напішы адказы.

**Варыянты адказаў:**
**Выракаюся. Не выракаюся.**
**Веру. Не веру. Амэн.**

*Святар*: Ці выракаешся граху, каб жыць у свабодзе дзяцей Божых?

*Народ*: . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

*Святар*: Ці выракаешся ўсяго, што вядзе да зла, каб грэх не панаваў над табою?

*Народ*: . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

*Святар*: Ці выракаешся сатаны — галоўнай прычыны граху?

*Народ*: . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

*Святар*: Ці верыш у Бога Айца ўсемагутнага, Стварыцеля неба і зямлі?

*Народ*: . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

*Святар*: Ці верыш у Езуса Хрыста, Сына Яго адзінага, Пана нашага, народжанага з Дзевы Марыі, замучанага і пахаванага, які ўваскрос з памерлых і сядзіць праваруч Айца?

*Народ*: . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

*Святар*: Ці верыш у Духа Святога, святы Касцёл Каталіцкі, еднасць святых, адпушчэнне грахоў, уваскрашэнне цела і жыццё вечнае?

*Народ*: . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

*Святар*: Гэта наша вера. Гэта вера Касцёла, вызнаваць якую — наш гонар у Езусе Хрысце, Пану нашым.

*Народ*: . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

## 2. Закончы сказы.



Сапраўдны сябра Езуса будзе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Сапраўдны сябра Езуса не будзе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

## 3. Напішы, што нам дапамагае падрыхтавацца да сустрэчы з Езусам у сакрамэнтах пакаяння і Эўхарыстыі.



. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

## ХАТНЯЕ ЗАДАННЕ: А Б В

1. Вывучы, што такое сакрамэнт хросту, карыстайся табліцай сакрамэнтаў у Дадатку.
2. Не забывай, што ты — сябар Езуса, старайся рабіць такія ўчынкі, каб Пан Езус табою ганарыўся, а не засмучаўся.



Малітва Езуса ў Аліўным садзе.

# 2. ЕЗУС ХРЫСТУС ВУЧЫЦЬ НАС МАЛІТВЕ

*Малітва — гэта размова чалавека з Богам, які любіць яго. Мы размаўляем з Богам так, як размаўлялі б з самым лепшым сябрам. Ён нас разумее і ведае пра нас усё.*



Перад тым, як распачаць малітву, неабходна суцішыцца. Вельмі важна прыняць адпаведную паставу цела, бо мы молімся ўсёю сваёю істотаю. Напрыклад, можна стаць на калені, выказваючы Богу сваю пашану і любоў. Самае галоўнае — зразумець, што ты знаходзішся ў прысутнасці нябачнага ўсемагутнага Бога. Пастарайся адчуць Ягоную прысутнасць і размаўляй з Ім шчыра і даверліва.

Бываюць розныя формы хрысціянскай малітвы, напрыклад, малітва **праслаўлення**, малітва **падзякі**, малітва **пакаяння** і малітва-**просьба**. Падчас малітвы мы выказваем Богу сваю любоў, дзелімся з Ім сваімі радасцямі і дасягненнямі, праблемамі і сумненнямі. У малітве мы захапляемся Богам, дзякуем за Яго дары, просім дапамогі і перапрашаем

за грахі. Аднак неабходна памятаць, што на малітве мы таксама павінны ўважліва слухаць голас Бога і распазнаваць Яго волю.

> Таму вы так маліцеся:
> Ойча наш, каторы ёсць у небе,
> свяціся імя Тваё.
>
> Евангелле паводле Мацвея 6, 9

Той, хто любіць Езуса, кожны дзень знаходзіць час на малітву.

Малітва бывае **індывідуальнай** і **супольнай**. Кожны можа сам індывідуальна маліцца заўсёды і ўсюды, у розных сітуацыях. А падчас агульнай малітвы мы молімся з бацькамі і роднымі, з сябрамі і з людзьмі, якіх сустракаем на святой Імшы, набажэнствах ці катэхезе.

**Святая Імша** — гэта самая галоўная і прыгожая малітва. У ёй Езус моліцца з намі і за нас. Падчас Імшы святар часта заклікае нас: «*Молімся!*». Гэтымі словамі ён нагадвае нам, што мы як адна вялікая парафіяльная сям'я звяртаемся да Бога. Удзельнічаючы ў святой Імшы і ў набажэнствах, мы адчуваем, што з'яўляемся часткаю Каталіцкага Касцёла.

## МОЙ КАТЭХІЗІС

**Малітва** — гэта асабістая і жывая сувязь дзяцей Божых з бясконца добрым Айцом, з Яго Сынам Езусам Хрыстом і з Духам Святым, які жыве ў іх сэрцах.









**1.** Выкарыстай слова ў цэнтры і дапішы, што Бог дае нам праз малітву.

........................................ М ........................................
........................................ А ........................................
........................................ Л ........................................
........................................ І ........................................
........................................ Т ........................................
........................................ В ........................................
....................................Д А ПАМОГА ..............................

**2.** Прыдумай малітвы і запішы іх ў табліцу.

| Малітва праслаўлення | Малітва падзякі |
| --- | --- |
| ................................ | ................................ |
| ................................ | ................................ |
| ................................ | ................................ |
| ................................ | ................................ |
| **Малітва пакаяння** | **Малітва-просьба** |
| ................................ | ................................ |
| ................................ | ................................ |
| ................................ | ................................ |
| ................................ | ................................ |

## 3. Прыклей пад малюнкамі адпаведныя подпісы *(гл. наклейкі)*.



Набажэнства Крыжовага шляху



Набажэнства Святога Ружанца



Штодзённая малітва



Святая Імша



Рараты



Адарацыя Найсвяцейшага Сакрамэнту

## ХАТНЯЕ ЗАДАННЕ:

1. Вывучы, што такое малітва. Адкажы, якія існуюць формы малітвы.
2. Старайся штодзённа маліцца шчыра, усім сэрцам.



# 3. СЛУХАЕМ І ВЫКОНВАЕМ БОЖАЕ СЛОВА

*Штогод ва ўсім свеце выдаецца больш за 1 000 000 розных кніг. Сярод іх ёсць вельмі цікавыя і пазнавальныя. Але самая ўнікальная і самая чытаемая кніга ў свеце — гэта Біблія, бо яе аўтарам з'яўляецца Пан Бог. Біблія — найкаштоўнейшая з кніг, таму што менавіта ў ёй Бог гаворыць пра сваю любоў да нас, пра тое, што Ён для нас робіць, каб мы былі шчаслівымі і маглі вечна жыць у раі.*

## БІБЛІЯ

### Стары Запавет

Гэта першая частка Святога Пісання. Яна ўключае 46 кніг. Кнігі Старога Запавету апавядаюць пра людзей і пра падзеі да нараджэння Езуса Хрыста.

### Новы Запавет

Гэта другая частка Святога Пісання, якая ўключае 27 кніг. Яны апавядаюць пра Пана Езуса і пра заснаваны Ім Касцёл.

Мы чытаем Святое Пісанне дома, на занятках па рэлігіі, а таксама ўважліва слухаем фрагменты з Бібліі на святой Імшы падчас **літургіі слова**. У гэты момант да нас прамаўляе сам Пан Бог, які запрашае нас да дыялогу.

У першым чытанні мы чуем словы са Старога Запавету. У канцы чытання лектар прамаўляе: «*Гэта слова Божае*», а мы адказваем: «*Дзякуем Пану Богу*», пасля спяваецца псальм. Затым мы слухаем другое чытанне — з Новага Запавету.

Пасля другога чытання спяваецца «*Аллелюя*», і мы рыхтуемся пачуць фрагмент з Евангелля. На словы святара «*Чытанне святога Евангелля паводле Мацвея* (або Марка, Лукі, Яна)» мы адказваем: «*Хвала Табе, Пане*». Адначасова мы робім маленькія крыжыкі:

- на ілбе, каб добра запомніць і зразумець Божае слова;
- на вуснах, каб расказваць іншым людзям пра Езуса;
- на сэрцы, каб прыняць словы Евангелля адкрытым сэрцам і кіравацца імі ў сваім жыцці.

Пасля таго, як святар прачытае Евангелле, ён прамаўляе: «*Гэта слова Пана*», а мы адказваем: «*Хвала Табе, Хрыстэ*».





Шчаслівыя, хто слухае слова Божае і захоўвае яго!

Евангелле паводле Лукі 11, 28

Часта нам патрэбна дапамога, каб зразумець сэнс словаў Святога Пісання. Мы звяртаемся з просьбаю растлумачыць нам Божае слова да бацькоў або катэхетаў. Найлепшае тлумачэнне мы атрымліваем падчас літургіі слова ў казанні святара. Атрыманыя веды мы выкарыстоўваем у жыцці і з радасцю дзелімся імі з іншымі.



## МОЙ КАТЭХІЗІС

**Святое Пісанне** — гэта Божае слова, скіраванае да людзей. Яно складаецца з кніг, напісаных людзьмі пад натхненнем Духа Святога. Біблія змяшчае ў сабе аб'яўленую Божую праўду.

**1.** Выкарыстай словы з рамкі і напішы правільныя адказы ўдзельнікаў святой Імшы.

| ЧАСТКІ ЛІТУРГІІ СЛОВА | МЫ ЧУЕМ | МЫ АДКАЗВАЕМ |
|---|---|---|
| Першае і другое чытанні | Закончыўшы чытанне, лектар гаворыць: «*Гэта слова Божае*». | ...............................<br>...............................<br>............................... |
| Чытанне Евангелля | Святар гаворыць: «*Чытанне святога Евангелля паводле N*». | ...............................<br>...............................<br>............................... |
| | Святар гаворыць: «*Гэта слова Пана*». | ...............................<br>...............................<br>............................... |

*Дзякуем Пану Богу.* *Хвала Табе, Пане.* *Хвала Табе, Хрыстэ.*

**2.** Намалюй крыжыкі на тых месцах, якія мы пазначаем крыжыкам перад чытаннем Евангелля.



**3.** Успомні, пра што Пан Бог гаварыў нам падчас нядзельнай святой Імшы. Напішы, што ты зразумеў і як стараешся выконваць Божае слова.

## Мой дзённік

..............................................................................

..............................................................................

..............................................................................

..............................................................................

..............................................................................

..............................................................................

..............................................................................

..............................................................................

..............................................................................

..............................................................................

## ХАТНЯЕ ЗАДАННЕ:

1. Вывучы адказы ўдзельнікаў святой Імшы падчас літургіі слова.
2. Індывідуальна чытай Біблію. Заўсёды ўважліва слухай слова Божае падчас святой Імшы і на занятках па рэлігіі, старайся жыць паводле Божага слова.



Вераніка выцірае твар Езусу.

# 4. ЕЗУС ХРЫСТУС ДАЕ НАМ ЗАПАВЕДЗЬ ЛЮБОВІ

*Мы ведаем, што Бог — наш Нябесны Айцец, Ён клапоціцца пра нас і благаслаўляе. Ён адарыў нас усім, што мы маем. Самае галоўнае — Ён даў нам як Збавіцеля свайго адзінага Сына Езуса Хрыста, бо любіць нас. А як мы можам паказаць Богу, што любім Яго?*

Езус Хрыстус даў дам **запаведзь любові**. Гэта самая важная запаведзь у жыцці хрысціяніна, выконваць якую — наш абавязак. А гучыць яна так:

## ЗАПАВЕДЗЬ ЛЮБОВІ

Любі Пана Бога твайго ўсім сэрцам тваім,
і ўсёю душою тваёю, і ўсім розумам тваім.

Любі бліжняга твайго, як самога сябе.



Бог хоча, каб мы любілі Яго ўсім сэрцам, каб мы слухалі Яго, даверыліся Яму і былі вернымі Яму. Але Бог хоча, каб мы выбіралі Яго ў свабодзе і любові. Ён заўсёды дасць нам сілы пераадолець зло на нашым шляху. А яшчэ Пан Бог хоча, каб мы любілі іншых людзей так, як іх любіць Езус.

Вось запаведзь Мая,
каб вы любілі адзін аднаго,
як Я палюбіў вас. Ніхто не мае
большай любові за тую,
калі хто жыццё сваё
аддае за сяброў сваіх.

Евангелле паводле Яна 15, 12–13



## Што значыць любіць так, як любіць Езус?

Мы ведаем, што Езус палюбіў нас дарэшты — не пашкадаваў свайго жыцця дзеля нашага збаўлення. Ён аздараўляў хворых, дапамагаў патрабуючым, прапаведаваў Добрую Навіну пра збаўленне, маліўся за іншых і нават за тых, хто Яго пераследаваў.



## Ці можам мы любіць так, як любіць Езус?

Не думаць толькі пра сябе і пра сваю карысць, не глядзець абыякава на чалавека ў патрэбе, прысвячаць яму час і прапанаваць сваю дапамогу. Не адказваць злом на зло... З Езусам мы ўсё зможам. А любоў, якою мы адорваем іншых, робіць нас шчаслівымі і напаўняе радасцю.



## Мой катэхізіс

### Дзве запаведзі любові

Любі Пана Бога твайго ўсім сэрцам тваім, і ўсёю душою тваёю, і ўсім розумам тваім.
Любі бліжняга твайго, як самога сябе.



1. Як ты разумееш выраз: «Любі Пана Бога твайго ўсім сэрцам тваім, і ўсёю душою тваёю, і ўсім розумам тваім»? Закончы сказы.

Я люблю Бога ўсім сэрцам, калі ....................................

..............................................................................

Я люблю Бога ўсёю душою, калі ....................................

..............................................................................

Я люблю Бога ўсім розумам, калі ....................................

..............................................................................

2. Намалюй малюнак на тэму: «Любі бліжняга твайго, як самога сябе».

## 3. Напішы, што добрага мы можам зрабіць, выкарыстоўваючы гэтыя прадметы?


1


2


3


4


5


6


7


8

1. ..........................................................
2. ..........................................................
3. ..........................................................
4. ..........................................................
5. ..........................................................
6. ..........................................................
7. ..........................................................
8. ..........................................................



## ХАТНЯЕ ЗАДАННЕ: А Б В

1. Вывучы на памяць дзве запаведзі любові.
2. Любі Пана Бога ўсім сэрцам, усім розумам і ўсёю душою. А ў кожным чалавеку старайся бачыць бліжніх і будзь добрым да ўсіх.